# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
18 ЧЭРВЕНЯ
1992 ГОДА
№ 11(1677)


ШТО ШУКАЕ САЦЫЁЛАГ

## МЫ ЧАКАЕМ ПЕРАМЕН

**У канцы мая факультэт сацыялогіі правёў апытанне студэнтаў універсітэта ў сувязі з надышоўшымі зменамі ў сістэме вышэйшай адукацыі. Блок пытанняў гэтага «інтэрвальнага параўнальнага даследвання», якое праводзіцца ў межах БДУ роўна праз год, быў часткова зменены ў параўнанні з мінулагоднім. На першым месцы стаяла выяўленне адносін да двухузроўневай сістэмы адукацыі. Гэта надзённае пытанне, таксама як і перспектыва ўвядзення платы за навучанне, магчымасць сацыяльнай абароны, гуманітарызацыя і беларусізацыя навучання ва універсітэце. Акрамя таго, у анкету былі ўключаны пытанні, актуальнасць якіх не знікае. Гэта і формы навучання, і адносіны да вольнага наведвання, і задаволенасць будучай прафесіяй. Пакуль анкеты апрацоўваюцца, вынікі апытання кожны можа прадбачыць, зыходзячы са свайго ведання «настрояў».**

ЧУЛІ?

## ЛАВІ МОМАНТ!

Цырульня ў пятым інтэрнаце, не паспеўшы як след зацвердзіцца ў студэнцкім асяроддзі, зачыніцца праз два-тры месяцы.

Гэта толькі своеасаблівы плацдарм для гаспадыні Сняжаны, якая будзе працаваць у прыватным салоне-цырульні, што ў хуткім часе адчыніцца на праспекце Машэрава.

Ужо месяц цырульня абслугоўвае студэнтаў і супрацоўнікаў бліжэйшых інтэрнатаў па цане самай ніжэйшай катэгорыі. У параўнанні, напрыклад, з цэнамі салона-цырульні «Мечта» тут прычоска каштуе ў паўтара-два разы танней. Дарэчы, і без чаргі: людзей чамусьці прыходзіць няшмат. Сняжана нават нагадала дні, калі абслугоўвала толькі па аднаму чалавеку.

Магчыма, справа ў тым, што не ведаюць студэнты пра такую цырульню. А можа ім зараз не да гэтага, а калі хто і хацеў бы змяніць свой знешні выгляд, дык пужаецца даўняй студэнцкай прыкметы — не стрыгчыся пад час сесіі.

У НАШЫМ ДВАРЫ

## СТУДЭНТ У СТАНЕ «ПАД ЧАС СЕСІІ»



*Калі добра падумаць над загадкай: зімою і летам аднаго колеру, то можна прыйсці да высновы, што гэта не толькі яліна і не толькі чорна-белы тэлевізар, а яшчэ і студэнт у стане «пад час сесіі».*

*Што вы звычайна робіце адразу, як толькі пашчасціла здаць нялёгкі экзамен? Тэлефануеце дадому? Набываеце і тут жа знішчаеце банан? Ці не адчуваеце нічога незвычайнага і працягваеце займацца штодзённымі справамі?*

*За адказамі — да студэнтаў.*

***Юра, філфак:***

*— Галоўнае — здаць экзамен. Нічога не загадваю наперад. І ўсё ж, калі ўсё абыйдзецца, дазволю сабе паласавацца куфелем піва.*

***Валера, фізфак:***

*— Для мяне здаваць экзамены — простая і звычайная справа. Таму не лічу гэта дасягненнем.*

***Віка, хімфак:***

*— Што я толькі не загадваю: і схадзіць у кіно, і набыць торт, і нават пакатацца на ровары...*

***Іван, геафак:***

*— За некалькі дзён да экзамену заўсёды з кім-небудзь спрачаюся — вялікі стымул. Былі выпадкі, калі ў спрэчцы перамагалі іншыя, але звычайна гэта мне вельмі дапамагае.*

***Валера, філфак:***

*— А нічога такога асаблівага не думаю. Але заўсёды пасля экзамену ёсць вялікае жаданне легчы і хоць трошкі адпачыць пад прыемную мелодыю.*

***Наталля, хімфак:***

*— Калі гэта апошні экзамен — магу астатнюю частку дня гуляць па праспекту. Калі не — дык звычайна адразу ж рыхтуюся да наступных выпрабаванняў.*

*Т. КАЗАК.*

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

Маргарыта Лапкоўская, мастацкі кіраўнік акадэмічнага хора студэнтаў, перакананa ў высокім узроўні майстэрства творчых калектываў, што існуюць пры універсітэце. Доказам гэтаму прыведзеныя ёй факты: рыхтуецца да ад'езду ў Нарвегію ансамбль «Неруш», на гастролі па маршруту Польшча — Германія — Данія паедзе акадэмічны хор студэнтаў. Ёсць запрашэнне з Італіі для ансамбля танца «Крыжачок».

Гэта не толькі прызнанне беларускага мастацтва, але і сведчанне вядомасці універсітэцкага імя далёка за межамі рэспублікі.

## СТЫПЕНДЫІ ІЗНОЎ ІДУЦЬ УГОРУ

З 1 мая бягучага года стыпендыі навучэнцаў і студэнтаў у чарговы (трэці з пачатку года) раз павышаны. У вышэйшых навучальных установах студэнты будуць атрымліваць: паспяваючыя ў памеры 800 рублёў у месяц. Хто вучыцца на «добра» і «выдатна» — 910. А круглыя выдатнікі — 1035 рублёў.

Павышаны штомесячныя грашовыя выплаты і студэнтам, якія засталіся без апекі бацькоў і на поўным дзяржаўным забеспячэнні, воінам-інтэрнацыяналістам і інвалідам, якія атрымалі калецтвы і раненні на вайсковай службе. Студэнтам за асаблівыя поспехі ў вывучэнні асобных дысцыплін і навукова-тэхнічнай творчасці можа ўстанаўлівацца персанальная стыпендыя Савета ВНУ у памеры 1050 рублёў у месяц. А таксама імянныя стыпендыі ўсіх відаў — 1365 рублёў у месяц.

Аспірантам вышэйшых навучальных устаноў, якія паступілі на работу непасрэдна пасля заканчэння навучальнай установы, а таксама з практычнай работы са стажам да 1 года пасля заканчэння навучальнай установы, і замежным аспірантам устанаўліваецца стыпендыя ў памеры 2000 рублёў у месяц; са стажам практычнай работы звыш года стыпендыі выплочваюцца ў памеры службовых акладаў (ставак) спецыялістаў, якія яны атрымлівалі да паступлення ў аспірантуру.

А ВЫ ЗМАГЛІ Б?

## ПАСЛЯ ЛІЦЭЯ — У БДУ

**Выхаванцы Беларускага гуманітарнага ліцэя ў гэтым годзе спалучаюць свае выпускныя экзамены па асобных дысцыплінах з уступнымі экзаменамі ў БДУ. Такім чынам, ва універсітэт жадаюць паступіць 5 ліцэістаў. Экзамены яшчэ ідуць, аднак вынікі паказалі, што выкладчыкі універсітэта больш патрабавальна ставяцца да якасці экзаменацыйных работ. Сачыненне ліцэісткі Каці Ткачэнка, якое адначасова разглядалася як сачыненне творчага конкурсу факультэта журналістыкі, было ацэнена выкладчыкамі ліцэя на «пяць», а выкладчыкамі БДУ — на «чатыры».**

**Дададзім яшчэ, што Беларускі гуманітарны ліцэй — адзіная ў рэспубліцы ўстанова, якая цалкам вядзе выкладанне на беларускай мове па нестандартных, самастойна распрацаваных праграмах. Клапоцячыся пра сваіх выпускнікоў, якія могуць мець цяжкасці пры паступленні з-за «несупадзення праграм», ліцэй дамовіўся з універсітэтам.**

ПАЛІТЫЧНЫ РЫНГ

## «ПРЫЕМНА, ШТО Ў МІНСКУ ЁСЦЬ ЛІБЕРАЛЫ...»

*Адбылася навукова-практычная канферэнцыя на тэму «Прынцыпы арганізацыі грамадства на аснове лібералізму», арганізаваная кафедрай паліталогіі БДУ сумесна з Аб'яднанай дэмакратычнай партыяй Беларусі (АДПБ).*

*Канферэнцыю можна разглядаць як адну з праяў палітычнага жыцця рэспублікі. Невыпадковым быў зварот да тэмы лібералізму. Зараз гэта адна з дзвюх асноўных тэндэнцый грамадскага развіцця рэспублікі, апазіцыйная так званаму «камуністычнаму кансерватызму». Беларускі лібералізм афарміўся ў апошнія гады. Яго прыхільнікі ўтвараюць шэраг невялікіх нацыянальных партый. Гэта актыўная апазіцыя ў парламенце. Таму палеміка, якая ўзнікае вакол тэорыі лібералізму, можа быць цікавай як пошук шляхоў развіцця.*

*Паколькі ў Расіі і Беларусі вопыт лібералізму надзвычай небагаты, дакладчыкі на канферэнцыі звярталіся да сусветна вядомых тэарэтыкаў лібералізму, напрыклад, да прац амерыканскага лiберала Ф. А. Хайека. У рэспубліцы ўпершыню гаварылася пра лібералізм на такім узроўні, і сказана было шмат. Аднак, прыгадаўшы шматлікія дыскусіі і непагадненні прамоўцаў, можна адзначыць некаторую размытасць вызначэння лібералізму і яго гісторыі.*

*Калі тэорыя лібералізму выклікала шмат супрацьлеглых меркаванняў, то мэтазгодна зірнуць на лібералізм «у дзеянні», на практыцы. У сувязі з гэтым на канферэнцыі прагучала прамова аб эканамічных зменах у рэспубліцы, і гэта інфармацыя «з першых рук» наўрад ці сустрэнецца ў іншым месцы. Яна — пра тое, што нас чакае.*

*З пункту гледжання эканамістаў, палітыка лібералізму вядзе зараз да змены адной элітнай групы кіраўніцтва на другую, якая будзе адпавядаць новай сітуацыі. Аснова эканамічных зрухаў сёння — безумоўна, прыватызацыя. План нашых лібералаў з парламента наконт яе быў «самы сацыялістычны»: усё раздаць. Ён жа зараз адзіна магчымы. Але...*

*У Беларусі ўжо 40 працэнтаў прадпрыемстваў прыватызавана. Рэальна прыватызацыя вядзе да стварэння ўласніка, прыватнай маёмасці. У Беларусі гэты працэс пачынаецца «знізу», са згоды рабочых, якія не жадаюць трымаць раздадзеныя акцыі на руках (ім патрэбна нешта больш матэрыяльнае). У згодзе з законам акцыі маёмасці (г. зн. сама маёмасць) будуць канцэнтравацца ў руках кіраўніцтва прадпрыемстваў (3—5 чалавек могуць трымаць пакет акцый). У перспектыве 5—6 працэнтаў ад працаздольнага насельніцтва будуць кантраляваць эканоміку рэспублікі. Так утвараецца «новая эліта».*

*Пакуль што прыватызуецца лёгкая прамысловасць. Будучае, на думку дакладчыка, за невялікімі прадпрыемствамі, дзе адказнасць можа ўзяць на сябе адзін чалавек. Пытанне аб прыватызацыі інтэлектуальнай маёмасці яшчэ не ставілася.*

*У выніку вышэйназваных працэсаў будзе фарміравацца сапраўдная прыватная ўласнасць. З'явіцца рынак акцый і чэкаў, якія зараз раздаюцца рабочым, і развіццё спекулятыўнай рыначнай уласнасці прывядзе да канцэнтрацыі ўласнасці ў прыватных руках. Адзначалася, што гэта адзіная магчымасць ажывіць мёртвую эканоміку. Накапленне пачатковага капіталу патрэбна для ўзнікнення малых прадпрыемстваў. Верагодна, што гэта будзе імклівы працэс. Выснова прамоўцы была такая: «Тое, што адбываецца,— выгадна для ўсіх».*

*Цікавасць да лібералізму як да комплексу ідэй, якія валодаюць розумамі, з боку беларускіх палітолагаў і членаў ліберальнай апазіцыі здаецца натуральнай. На канферэнцыі прагучала цікавая думка: «Сацыяльныя і палітычныя перакананні вызначаюць тэхнакратычную пабудову грамадства (так, таталітарны лад нарадзіў камандную эканоміку)». І хаця тэорыя лібералізму, як паказала канферэнцыя,— рэч вельмі неадназначная, усё ж такі сёння неабходна шукаць падыходы да гарманізацыі чалавека і грамадства, нават у такой змрочнай сітуацыі, як наша.*

# КАБ СВЕТ ВЕДАЎ БОЛЬШ ПРА БЕЛАРУСЬ

***«Папялушка Еўропы»,— так вобразна назваў адзін са сваіх артыкулаў пра Беларусь аўстрыйскі аматар-перакладчык з беларускай мовы Фердзінанд Найрайтэр, які ў сваім выступленні на Міжнародным кангрэсе беларусістаў свету ў Мінску інтэрпрэтэраваў, дарэчы, што «папялушка» — «золушка» хутка стане каралевай.***

***Як мы памятаем, папялушцы дапамагла стаць прынцэсай чароўная Фея — сейбіт «разумнага, добрага, вечнага», а значыць, найперш ведаў.***

***Сёння мы шмат гаворым і пішам аб тым, як нам найхутчэй увайсці ў вольную сям'ю народаў Еўропы, спадзяемся на дапамогу з Захаду, але мала ўсведамляем пры гэтым, што мы — Беларусь і беларусы — самі па сабе ўяўляем надзвычайную цікавасць і нясем у сабе незлічоныя багацці, якія могуць прыцягваць свет і самых розных людзей у вялікім свеце.***

***Тыя багацці — гэта нашы веды, тое, што мы ўмеем і можам рабіць. Мы можам не толькі прасіць, але і даваць. Мы багатыя ўжо тым, што маем.***

***На працягу стагоддзяў Беларусь дала свету больш, чым свет ведае пра яе. Гэта аксіёма, прынамсі, для тых, хто мала-мальскі знаёмы з айчыннай гісторыяй, культурай, пранікся духоўнай спадчынай нацыі, усведамляе формы і змест быта і быцця роднага народа.***

***Менавіта зыходзячы з дадзенага тэзіса ў поглядзе на нашы духоўныя набыткі, была і выпрацавана тая асноўная канцэпцыя, на аснове якой паспяхова і распачала сваю працу ў Мінску пры Беларускім дзяржаўным універсітэце Міжнародная школа беларусістыкі (МШБ) — беларускай мовы, літаратуры і культуры.***

Як аказалася на практыцы, у асяроддзі вучоных-славістаў жыла і жыве трывалая цікавасць да вывучэння адной з рэдкіх, унікальных, даволі самабытных моў свету — менавіта да беларускай мовы, роўна як і да створанага на гэтай мове багацейшага пласта беларускай літаратуры, да культуры, традыцый, фальклору, абрадаў і звычаяў, нацыянальнага побыту (кухні, адзення, народных рамёстваў, дойлідства), да нораваў і маралі, да менталітэту народа, ягонага характару, нацыянальнай псіхалогіі, свядомасці, да ўсяго таго, што мы называем велізарнейшым гістарычным духоўным скарбам нацыі.

Летам мінулага года МШБ працавала ў два тэрміны — у ліпені і ў жніўні. На працягу месяца слухачамі школы пажадалі стаць больш як 30 навукоўцаў з Польшчы, Германіі, Чэха-Славакіі.

Першымі слухачамі школы сталі віцэ-прэзідэнт Міжнароднай Асацыяцыі беларусістаў свету з Польшчы доктар М. Кандрацюк — з Варшавы, а таксама прафесары А. Барташэвіч, таксама з Варшавы, Б. Франкоўска са Шчэціна, Т. Левашкевіч — з Познані, з Германіі — доктар Н. Брэдэрлоў. Сярод слухачоў былі навуковыя супрацоўнікі, педагогі, студэнты, перакладчыкі, вядомыя ў навуковым свеце вучоныя-славісты. З Польшчы — магістры беларускай філалогіі М. Урублеўскі, доктар М. Вінярскі з навукова-даследчага інстытута праблем адукацыі ў Варшаве, з Інстытута фізічнай культуры ў Гожуве — Ірэна Федарук, навуковыя супрацоўнікі з Інстытута славяназнаўства Польскай Акадэміі навук П. Цэтра, К. Карабовіч, студэнты з Беластоку і Любліна — Х. Місеюк, Б. Рушкоўскі, а таксама студэнты філасофскага факультэта Карлава універсітэта ў Чэхіі Р. Крыжова, Р. Кунцова, І. Луптоўцава, студэнт з Кіева — С. Грэценка і іншыя.

Слухачы займаліся па насычанай вучэбнай праграме. Рабочы дзень будаваўся такім чынам, што ледзь сонца добра ўзыйдзе, штодня — з дзевяці гадзін раніцы і да адзінаццаці — практычныя заняткі па беларускай мове, затым лекцыі — па літаратуры, гісторыі, культуры, а пасляабедзенная пара адводзілася на дыскусіі, сустрэчы, круглыя сталы, працу ў архівах, бібліятэках, наведванне музеяў.

Па просьбе слухачоў былі зроблены ксеракопіі навуковых артыкулаў, урокаў па беларускай мове і літаратуры, тэкстаў народных песень, а таксама фоназапісы фальклорных матэрыялаў, якія многія са слухачоў павезлі з сабою, каб выкарыстаць у сваёй далейшай навукова-педагагічнай практыцы. Многія навукоўцы-педагогі ўпершыню распачыналі выкладаць беларускую мову і літаратуру ў сваіх універсітэтах.

Лекцыі ў МШБ чыталі вядомыя ў Беларусі вучоныя мовазнаўства, літаратуразнаўства, гісторыі, культуры: Л. М. Шакун, А. А. Лойка, А. Я. Супрун, Я. І. Юхо, А. І. Мальдзіс, А. П. Грыцкевіч, А. А. Крывіцкі, А. Д. Ляўковіч, Г. А. Цыхун, В. Д. Ліцвінка, У. Л. Сакалоўскі, В. Ф. Шалькевіч, А. М. Аляхновіч, Ю. В. Хадыка і іншыя.

Слухачы МШБ наведалі тэатры, пазнаёміліся з гарадамі Мінск, Несвіж, Мір, Навагрудак, Вільнюс. Пабывалі ў Заслаўі, Вязынцы, адпачывалі на возеры Нарач, удзельнічалі ва ўсебеларускім свяце Купалле на гары Радагошча ў Навагрудскім раёне, сустракалі ўзыход сонца над славутым і чароўным возерам Свіцязь. Думаецца, не толькі веды, але і незабыўныя краявіды Беларусі павезлі ў сваёй памяці дамоў слухачы школы беларусістыкі.

Сёлета МШБ другі раз гасцінна расчыняе свае дзверы для ўсіх жадаючых. Летняя сесія будзе праводзіцца з 1 да 25 жніўня. Слухачоў чакае не менш насычаная вучэбная праграма і цікавыя вандроўкі.

Ужо сёння ёсць заяўкі на ўдзел у летнім семінары ад вучоных славістаў з Польшчы, Аўстрыі, Швейцарыі, Германіі, Італіі, Англіі, Амерыкі.

Пад час вучобы ў МШБ Міжнародная Асацыяцыя беларусістаў свету, у цесным кантакце з якой працуе школа, Скарынінскі навукова-асветніцкі Цэнтр 19—20 жніўня праводзяць з удзелам слухачоў школы беларусістыкі навуковую канферэнцыю «Адраджэнне нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа». А на заканчэнне вучобы ў МШБ, 21 жніўня, Бедзяржуніверсітэт і ягоныя літаратурныя кафедры арганізоўваюць Міжнародны сімпозіум на тэму: «Творчая спадчына Янкі Купалы і Якуба Коласа ў кантэксце духоўнай культуры народаў свету» да 110-й гадавіны з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры.

Праграма, як бачым, даволі разгорнутая, змястоўная. Яе ажыццяўленню і навуковай глыбіні ў многім павінна садзейнічаць і прадстаўніцтва вучоных з-за мяжы, геаграфія набору слухачоў у МШБ у гэтым годзе.

Заняткі ў МШБ, як прынята, будуць весціся з улікам ведання беларускай мовы: у пачатковай групе, з паглыбленым навучаннем і па індывідуальнай праграме. Несумненна, што будзе і інтэнсіўная штодзённая моўная практыка, і праца ў архівах і бібліятэках, будзе і развучванне беларускіх народных песень, бо праз песню таксама беларускае слова западае ў душу, каб застацца там назаўсёды, будуць новыя сустрэчы, знаёмствы, кантакты ды цікавыя падарожжы па Беларусі.

Імкненне да ведаў — гэта прарыў у будучае. Хацелася б адзначыць, што дзякуючы наладжаным за апошні час кантактам з навукоўцамі з іншых краін мы сёння маем даволі моцныя цэнтры беларусазнаўства ў Цюрыху (Швейцарыя), дзе плённа працуе на беларускай ніве загадчыца славістычнага аддзела гарадской бібліятэкі Моніка Банькоўска-Цуліг, умацоўваюцца сувязі з Шэлфідскім універсітэтам у Англіі, у якім працуе Пітэр Майо, аўтар граматыкі беларускай мовы для тых, хто гаворыць па-англійску. Гэта першае такое выданне за мяжой, праца аб'ёмная, глыбокая, карпатлівая. Дзякуючы намаганням таленавітага вучонага-слáвіста, даўняга і добрага сябра МШБ доктара Германа Бідэра, аўтара цэлага шэрагу грунтоўных прац па беларускай філалогіі і культуры, у кастрычніку мінулага года быў праведзены Міжнародны Сімпозіум «Моўная і культурная палітыка на Беларусі» з удзелам беларускіх навукоўцаў Л. М. Шакуна, У. Л. Сакалоўскага, Г. Ф. Герасіменкі і аўтара гэтых радкоў. Ля вытокаў утварэння МШБ стаялі прафесар Дэймс Дзінглі з Інстытута славістыкі з Лонданскага універсітэта, прафесар Томаш Бэрд з Нью-Йорку, з якімі і сёння падтрымліваюцца самыя цесныя навуковыя і дзелавыя сувязі.

Зусім нядаўна поўны курс навучання ў школе завяршыў выпускнік Балонскага універсітэта ў Італіі Паола Гальвані, які, вывучыўшы дома пяць замежных моў (рускую, кітайскую, англійскую, іспанскую, балгарскую), вырашыў авалодаць яшчэ і беларускай. Варта было чуць, як зусім нядрэнна пачаў гаварыць па-беларуску гэты таленавіты юнак, які выявіў незвычайныя здольнасці ў авалоданні мовамі і які павёз з сабою з Мінска творы беларускіх класікаў, каб перакласці іх на італьянскую мову. Аказваецца, што і за невялікі прамежак часу можна авалодаць зусім незнаёмай мовай. Толькі б захацець! Ці не стане гэта добрым прыкладам для паасобных нашых службоўцаў і афіцыйных асоб, парламентарыяў, якія ўсё яшчэ марудзяць з авалоданнем роднай мовай, так і не гавораць на мове карэннага насельніцтва. Школа беларускай філалогіі гатова дапамагчы ім і ў гэтым.

Сёння МШБ рыхтуецца прыняць новых слухачоў. Але зараз лёгка сказаць прыняць, цяжэй, а часам неймаверна цяжка гэта зрабіць на сапраўдным добрым узроўні, як таго патрабуюць міжнародныя стандарты. Хоць не будзем прыбядняцца. Добрыя памяшканні атрымаў філалагічны факультэт, за што ён шчыра ўдзячны, у будынку былой школы партыйнай наменклатуры. Можна дабавіць сюды інтэрнат, сталоўку насупраць. Кадры выкладчыкаў у нас ёсць, вопыт практычнай работы яны назапасілі немала. Да гэтага хочацца дадаць гасціннасць, зычлівасць, цеплыню сэрцаў нашых людзей, непаўторнасць і каларыт беларускага жыцця, што мае, можа, найвялікшую каштоўнасць у нашых цяперашніх умовах і цэніцца часам больш, чым «пяцізорачны» фешэпебельны гатэль. «Элітарны семінар», — так ахарактызаваў сваё прабыццё ў Мінску летась прафесар з Познані Тадэвуш Левашкевіч. Цёпла, па-таварыску, па-сяброўску, па-сямейнаму вітае сваіх гасцей школа і універсітэт.

Хацелася б звярнуцца да дзелавых колаў, да нашых прадпрымальнікаў, спадзеючыся знайсці сярод іх уплывовых (ды багатых!) спонсараў, або фундатараў, як кажуць, каб працаваць разам, разгортваючы розныя культурна-асветніцкія і эканамічныя праграмы, школы бізнесу, курсы навучання на роўні з роднай іншым, замежным мовам.

У МШБ паступілі цікавыя прапановы на гэты конт з некаторых славістычных і агульнаадукацыйных прадпрымальніцкіх цэнтраў з Англіі, Швейцарыі, Францыі. Фінансуюць жа нашы бізнесмены разнастайныя «вясёлыя» праграмы, конкурсы, праводзяць дабрачынныя акцыі, чаму б не накіраваць пэўную частку сродкаў па падтрыманне імкнення да вучобы, на пазнанне культурнага жыцця іншых народаў. Выгада тут відавочная. МШБ мае сувязі, бадай, з большасцю славістычных і агульна-адукацыйных цэнтраў Еўропы, многія з якіх выказваюць жаданне арганізаваць курсы бізнесу «дома», у нас, з далейшай практыкай і знаёмствам з дзелавым светам у краінах за мяжой.

Калі ласка, Савет прадпрымальніцтва, запрашаем да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Сродкі, якія ўкладзены ў адукацыю, навуку — самыя эфектыўныя і разлічаны на доўгую перспектыву.

Не гаворачы пра тое, што Мінск сёння прыцягвае людзей самых розных прафесій з розных краін, многія з якіх маглі б упаўне «прайсці» школу краіназнаўства, трапіўшы на летнія курсы пры БДУ. Запрашаем!

Увогуле, думаецца, усім нам трэба сёння вучыцца не толькі браць, але і аддаваць. Адкрываючы свет, адкрываць і сябе. Са школай беларусазнаўства, мяркуецца, добра маглі б супрацоўнічаць нашы прадпрыемствы народных рамёстваў, фабрыкі і арганізацыі, новыя фонды і камітэты.

У сённяшніх умовах, калі куды ні кінь — усюды клін, нялёгка ажыццяўляць праграму такіх летніх школ. Спадзяемся на добрае стаўленне да Міжнароднай школы беларусістыкі з боку зацікаўленых арганізацый і афіцыйных структур, з боку дзяржаўных структур улады.

Калісьці, ужо, здаецца, і нямала гадоў таму назад, калі ідэя ўтварэння школы беларусазнаўства яшчэ толькі прабівала сабе дарогу, на адной з нарад у Белдзяржуніверсітэце С. С. Шушкевіч, тады яшчэ працуючы прарэктарам па навукова-даследчай рабоце ва універсітэце, сваім пытаннем і рашучай падтрымкай «падвёў рысу» пад гутаркай на гэтую тэму: «Колькі трэба сродкаў на гэтую патрэбную справу?» — і тут жа, пачуўшы сціплы адказ, сказаў — як адрэзаў: «Я даю Вам гэтыя грошы».

Сёння няёмка, здавалася б, прасіць сродкі. Нас скрозь арыентуюць на тое, каб самім навучыцца зарабляць. Але, думаецца, калі справа зрушылася з месца, пайшла, як кажуць, самым неабходным было б яе падтрымаць і паставіць на шырокую дзяржаўную аснову, пайсці на ўтварэнне новых цэнтраў навучання, што называецца на парадак вышэй.

***Нашай рэспубліцы неабходны, як паветра, народны універсітэт ці, на першы час, летні універсітэт, якія ёсць ва ўсіх развітых краінах свету, цэнтр, дзе б былі засяроджаны ў адзінае цэлае славістыка, айчынная і замежная, іншыя навукова-культурныя і вучэбныя праграмы, звязаныя з рознымі галінамі эканомікі, медыцыны, прамысловасці.***

***У кожнай ВНУ ёсць аддзелы замежных сувязей, а ў штаце дэканатаў — намеснікі па рабоце з замежнымі студэнтамі, кафедры з выкладчыкамі на іх, якія працуюць пакуль што ў адзіным рэчышчы — вывучэнне мовы суседняй дзяржавы. А ці не лепш было б аб'яднаць усё гэта — і бібліятэчныя фонды, усё выкладанне ў адзін комплекс і з'арыентаваць работу на нацыянальныя патрэбы.***

***ВНУ, творчыя арганізацыі і грамадскія фарміраванні, таварыствы, аб'яднанні, суполкі, якія знаходзяцца ў Беларусі і за яе межамі, могуць ці маглі б устаноўліваць свае пастаянныя стыпендыі, цяпер у МШБ, а ў будучым, магчыма, ва універсітэце, і штогод накіроўваць на вучобу сваіх слухачоў у любы зручны для іх час і на любы тэрмін, які неабходны для падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі, навуковай і дзелавой стажыроўкі, выканання навуковых даследванняў, рэалізацыі дзелавых пагадненняў, прапаноў, ды ўвогуле для азнаямлення з эканамічным, культурным і грамадскім жыццём у Рэспубліцы Беларусь.***

***Дапамагчы стаць багацейшым яшчэ на адну мову, культуру, нацыянальныя традыцыі старадаўняга беларускага народа — справа вартая і пачэсная на нашым шляху адраджэння і рэальнага напаўнення незалежнасці, у будаўніцтве духоўнага нацыянальнага дому.***

*Уладзімір НАВУМОВІЧ,*
*дырэктар Міжнароднай школы беларускай мовы, літаратуры і культуры, дацэнт.*

НА КНІЖНАЙ ПАЛІЦЫ

# СТАНЬЦЕ ВЕГЕТАРЫЯНЦАМІ!

### ПІРОГ СЕЛЬСКІ

1 кг бульбы, 1 цыбуліна, алей, соль, чорны перац, 5 лыжак мукі.

Бульбу памыць, пачысціць, нацерці на тарцы, пакласці на сіта. Калі сок сцячэ, перакласці мякаць у міску, дадаць дробна парэзаную і падсмажаную на алеі да янтарнага колеру цыбулю, соль, перац, муку, перамяшаць. На змазаную алеем бляху пакласці масу роўным слоем, папырскаць алеем і запекчы ў духоўцы — прыкладна 1 гадзіну.

Есці ў гарачым выглядзе. Можна паліць смятанай.

### СОУС ТАТАРСКІ

1 шклянка маянэзу, 1 бялок, 2—3 карнішона, 5—6 марынаваных грыбоў, соль, цукар, 1/3 шклянкі смятаны.

Бялок зварыць крута, астудзіць, дробна пакрышыць. Карнішоны і грыбы парэзаць. Усе кампаненты змяшаць з маянэзам, прыправіць па густу соллю і цукрам, змяшаць са смятанай.

### СУП З ЯЧНЫМІ КРУПАМІ

Набор зяляніны і гародніны, 1/2 шклянкі ячных крупаў, 10 г сушаных грыбоў, 250 г бульбы, 6 шклянак вады, 1/3 шклянкі смятаны, соль, зяляніна пятрушкі.

Зяляніну і гародніну, а таксама бульбу, памыць, пачысціць, парэзаць на дробныя кавалачкі, дадаць памытыя сушаныя грыбы і крупы, зварыць. Пасаліць, дадаць смятану і пакрышаную зяляніну пятрушкі.

Гэтыя рэцэпты — з кнігі «Вегетарыянства». Вегетарыянскія стравы», якая перакладзена з польскай мовы і выходзіць сёлетнім летам у выдавецтве «Полымя».

Кніга незвычайная. Яна з'яўляецца першай кнігай пра вегетарыянства не толькі ў рэспубліцы, але і ў СНД, нягледзячы на тое, што Леў Талстой быў у нас заснавальнікам вегетарыянства і да сённяшняга дня мае дзесяткі тысяч паслядоўнікаў у свеце.

«Вегетарыянства. Вегетарыянскія стравы» складаецца з дзвюх кніг, аб'яднаных у адну. Першая частка напісана шырока вядомым у Польшчы і за яе межамі ўрачом герантолагам К. Вісьнеўскай-Рашкоўскай. У ёй пераканаўча раскрываюцца аздараўленчыя аспекты вегетарыянскага харчавання, як правільна зразумелае вегетарыянства гарантуе людзям поўнае здароўе і даволі доўгае жыццё, як яно ўплывае на лячэнне такіх хвароб, як склероз, гіпертанія, цукровы дыябет, экзема, рак страўніка, рэўматызм і інш. У кнізе даюцца прыклады дыетычнага харчавання з выкарыстаннем галадання, садавіна-гароднінна і вегетарыянскай лячэбнай дыеты маскоўскага прафесара Ю. С. Нікалаева і швейцарскага ўрача Бірхер-Бенера, аўтара тэорыі харчовых комплексаў.

Кніга каштоўная і тым, што яна не адарваная ад жыцця і быццам прыстасавана да нашага нялёгкага часу. Упэўнена, што пасля знаёмства з ёй многія пераканаюцца, што з любой сітуацыі можна знайсці выйсце, а са звычайных прадуктаў на нашых паліцах можна прыгатаваць смачны і карысны абед. 930 прыведзеных у кнізе рэцэптаў яскрава сведчаць аб гэтым. Яны належаць В. Піатравякавай і змешчаны ў другой частцы кнігі. Тыя, хто набудзе яе, не пашкадуюць аб гэтым. Яна з'явіцца добрым дарадчыкам гаспадыням.

Кнігу можна заказаць па адрасу: 220600, г. Мінск, пр. Машэрава, 11, выдавецтва «Полымя».

Перакладчык кнігі
С. ГУЛЬЯНЦ.

ЯКРАЗ ДЛЯ ВАС

# «РОДНАЕ СЛОВА»

Майскі нумар часопіса «Роднае слова» («Беларуская мова і літаратура ў школе») пачынаецца з нататкі пра тое, як вядзецца падрыхтоўка да акадэмічнай канферэнцыі па беларускім правапісе. Гаспадарскі клопат пра ўнармаванне правапісу ёсць і ў артыкулах аб беларускіх найменнях хімічных элементаў, аб правапіснай норме накшталт бярэм, нясем. У гэтым жа раздзеле — «Школа і нацыянальнае адраджэнне» — працяг размовы пра змест літаратурнай адукацыі ў нашых школах.

Часопіс змяшчае матэрыялы, у якіх з розных пазіцый разглядаюцца асаблівасці творчасці роднага песняра Янкі Купалы, празаікаў Леаніда Дайнекі, Вячаслава Адамчыка, больш маладых пісьменнікаў Алеся Асташонка, Адама Глобуса, Андрэя Федарэнкі, Анатоля Казлова. Падаюцца артыкулы па методыцы выкладання мовы (у прыватнасці, аб выкарыстанні на ўроках апорных канспектаў). Нататкі па гісторыі беларускага мовазнаўства (са спадчыны Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага) ілюстраваны цікавай картай, складзенай паводле работ вядомага даследчыка-беларусіста. На ёй паказана пашыранасць беларускіх гаворак на тэрыторыях па-за межамі сучаснай Беларусі.

У раздзеле «Калі законччыўся ўрок» змешчаны матэрыялы для арганізатараў беларускамоўных летнікаў.

Раздзел «На ростанях» распачынаецца нататкамі пра купалаўскія мясціны на Міншчыне. У ім падаецца таксама матэрыял пра мастакоўскі талент Уладзіслава Галубка, артыкул «Перад мінуўшчынай і вечнасцю», у якім ідзе размова пра неабходнасць паважліва ставіцца да месцаў апошняга людскога спачынку, шанаваць памяць продкаў.

Часопіс знаёміць чытачоў з творчасцю і развагамі пра надзённае і вечнае мастака Міколы Купавы, адзначае ўгодкі асобных літаратараў, змяшчае вершы выкладчыка з Магілёва Васіля Рагаўцова.

Агляд падрыхтаваў
Іван ЖДАНОВІЧ,
супрацоўнік рэдакцыі часопіса.

ВЫЙШЛІ ЎСЕ МЫ З АРХІВА

# ЗНАЁМЫЯ ЎСЁ ТВАРЫ

***Нейкая частка вашага жыцця застанецца... у архіве. Ці думаеце вы пра гэта калі-нікалі? Гэта ж неблагі стымул для актыўнай дзейнасці і трывалая падстава для ўпэўненасці, што нічога на свеце не знікае бясследна.***

***Ва універсітэцкім архіве, куды мы запрашаем вас ужо не ўпершыню, можна сустрэць мноства знаёмых імён і дакрануцца да пажоўклых папер, якія некалі трымалі рукі знакамітых людзей.***

Іван Паўлавіч Мележ таксама працаваў ва універсітэце. Яго асабістая справа на 17 старонках была распачата 2 ліпеня 1948 года, а скончана 6 верасня 1951 года. Адкрывае яе заява аспіранта Мележа прарэктару Белдзяржуніверсітэта Н. Е. Рагозіну: «Прашу залічыць мяне на наступны навучальны 1948—49 год на работу ва універсітэце ў якасці выкладчыка беларускай літаратуры».

Позірк на адухоўлены, разумны твар маладога Івана Мележа на маленькім фотаздымку ў кутку асабістага лістка па ўліку кадраў нараджае пытанне: а ці былі ў тагачасным аддзеле кадраў універсітэта фізіянамісты, якія прадказалі аспіранту бліскучыя перспектывы, альбо графолагі, якія адразу згадзіліся з гэтым прагнозам, калі ўбачылі почырк пісьменніка? Цяпер здаецца, яго незвычайны талент павінен быў выглядаць відавочнасцю для ўсіх. Між тым, Мележу, як і ўсім яго сучаснікам, даводзілася пры паступленні на работу адказваць і на такія пытанні: «Ці былі ваганні ў правядзенні лініі партыі і ці ўдзельнічаў у апазіцыях (якіх, калі)?; «Ці быў у палоне?»; «Ці служыў у войсках ці ўстановах белых урадаў?».

Цікавейшай за адказы на гэтыя пытанні выглядае аўтабіяграфія Івана Мележа, якую ён напісаў, калі паступаў на работу ва універсітэт:

«Нарадзіўся ў 1921 годзе ў в. Глінішча, Хойніцкага раёна, Палескай вобласці. Бацькі — сяляне, з 1929 года да цяперашняга часу працуюць у калгасе (за выключэннем двух з паловай год, калі мясцовасць была акупіравана нямецкімі захопнікамі). У 1938 годзе я скончыў Хойніцкую сярэднюю школу № 1, пасля чаго амаль год працаваў на кіруючай камсамольскай рабоце ў апараце Хойніцкага райкома камсамолу. У верасні 1939 года паступіў у Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры, адкуль быў прызваны ў рады Чырвонай Арміі. З першых дзён вайны ўдзельнічаў у баях на Паўднёвым фронце ў якасці нам. палітрука, камандзіра гарматы, а потым — камісара батарэі і супрацоўніка рэдакцыі газеты «Красноармейская правда». Пасля цяжкага ранення быў звонены ў кастрычніку 1942 года з арміі і працаваў выкладчыкам ваеннай падрыхтоўкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта (п. Сходня, Маскоўскай вобласці) і Малдаўскага педінстытута (г. Бугуруслан, Чкалаўскай вобласці). Адначасова з работай вучыўся, спачатку — завочна, а потым перайшоў на стацыянарнае аддзяленне. У 1945 годзе скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт і паступіў у аспірантуру па кафедры беларускай літаратуры. Здаў кандыдацкі мінімум і ў сучасны час працую над дысертацыяй. Па сумяшчэнню працую ў Саюзе савецкіх пісьменнікаў БССР, як пісьменнік.

Член ВКП (б) з 1940 года, п/б № 3929773. Член Саюза савецкіх пісьменнікаў.

2/VI—48 г. Іван Мележ».

Чамусьці няма ў аўтабіяграфіі ўпамінання і пра універсітэцкі дыплом з адзнакай, і нра ўзнагароды, атрыманыя ў час Вялікай Айчыннай вайны: ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За абарону Каўказа», «За перамогу над Германіяй», «За доблесную працу».

Спачатку малады выкладчык кафедры беларускай літаратуры Іван Паўлавіч Мележ атрымліваў 1200 рублёў у месяц, потым — 1500. На жаль, у папцы з асабістай справай не захоўваюцца запісы лекцый і распавяданні студэнтаў аб атмасферы, што панавала на занятках, якія вёў выкладчык Мележ...

20 жніўня 1951 года ён напісаў апошнюю заяву, якая захоўваецца ў справе, на імя загадчыка кафедры беларускай літаратуры: «У сувязі з хваробай, якая патрабуе доўгага лячэння, я не змагу працаваць у гэтым годзе ва універсітэце, а таму прашу вызваліць мяне на 1951—52 навучальны год ад абавязкаў старшага выкладчыка беларускай літаратуры. Іван Мележ».

Яшчэ адна папка з архіва — танчэйшая, усяго на 5 старонках. Гэта асабістая справа Ігара Міхайлавіча Лучанка. Знаёміць яна нас з самымі нечаканымі і таму вельмі цікавымі рэчамі. 6 сакавіка 1959 года студэнт 3-га курса фартэпіяннага факультэта Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Ігар Лучанок напісаў заяву на імя рэктара Белдзяржуніверсітэта прафесара Сеўчанкі А. М.: «Прашу прыняць мяне на работу ў якасці акампаніятара на занятках па мастацкай гімнастыцы». Студэнт Лучанок быў залічаны на кафедру фізічнага выхавання і спорту з пагадзіннай аплатай. І хто з тых дзяўчат, чые практыкаванні суправаджаў акампанемент трэцякурсніка кансерваторыі, мог падумаць, што ён — вядомы кампазітар Лучанок у будучым? Ці ўспамінаюць яны тыя заняткі зараз? А сам Ігар Міхайлавіч?

У 1959 годзе яго аўтабіяграфія была яшчэ зусім кароткай:

«Я, Лучанок Ігар Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1938 годзе ў горадзе Мінску. У час Вялікай Айчыннай вайны сям'я эвакуіравалася ў савецкі тыл, у г. Сальск Растоўскай вобласці, дзе знаходзілася да 1946 года.

З 1946 года жывём у горадзе Мінску, дзе я скончыў Мінскую музычную школу-дзесяцігодку. У школе ўступіў у рады членаў ВЛКСМ.

У 1956 годзе паступіў у Беларускую дзяржаўную кансерваторыю на фартэпіянны факультэт, дзе займаюся зараз на трэцім курсе. 6/III—59 г.».

Прачытаўшы гэту звычайную аўтабіяграфію не зусім звычайнага чалавека, так хочацца знайсці і ў сваёй штодзённасці неардынарныя праявы. А вам таксама?

Старонкі архіўных дакументаў гартала
В. БЯГУН.

ЦУДОЎНАЯ НАВУКА АСТРАЛОГІЯ

# ЗОРКІ ПАКІДАЮЦЬ ВЫБАР

***Прапануем вам яшчэ адзін урывак з кнігі Жаклін Сталоне «Улада зорак» (папярэдні вы маглі прачытаць у мінулым нумары «БУ»).***

КАЗЯРОГ (22/12—19/1)

Нялёгкая ў мяне задача, але нехта павінен узяць на сябе брудную работу растлумачыць тым, хто ўзбіраецца на вяршыню, чаму ніхто на гэтым свеце не прапускае магчымасць сказаць пра вас дрэннае слова. Вы ж не чапляецеся да іншых, як Дзевы, не ўказваеце ўсяму свету, як трэба жыць, як робяць гэта генералы-Авены. Львы, з іх вечным жаданнем рабіць усё напаказ, абсалютна чужыя вам. Магчыма, вы можаце зразумець, чаму людзі пляткараць пра легкадумных Блізнят, але вы ніяк не ўсвядоміце, чаму Казярогі заўсёды становяцца мішэнню ўсіх астралагічных кпінаў.

Ды таму, што вы нясцерпна сур'ёзныя. Сатурн, ваша планета, вядомы дысцыплінарнай строгасцю, пастаянна стаіць у вас над душою. Вас напэўна праследуе ўнутраны голас, які нагадвае вам, што вы не скончылі хатняе заданне ці не аддалі доўг. Вас грызе непакой, што вы не дасягнулі дастаткова высокага становішча? Ці вы хвалюецеся, што недастаткова хутка паднімаецеся на вяршыню гары? Вы, магчыма, пакутуеце ад хранічнага страху, што ў вас аслабне рука ў прамым і пераносным сэнсе. А мы ж яшчэ і не пачалі гаварыць пра ваш адмоўны бок! Пакуль яшчэ толькі жартуем.

Зямны знак Казярога прымушае вас дабівацца вяршынь поспеху, інакш вы адчуваеце, што пражылі дарэмнае жыццё. Грошы, кар'ера, прызнанне, фізічнае здароўе, інтымная блізкасць — усе гэтыя сферы ўяўляюць для вас велізарную важнасць. Большасць з вас лічаць сябе ахвярамі несправядлівасці ў гэтым свеце і таму працуюць упарта, каб дасягнуць вышынь ва ўсіх галінах. Разумееце вы гэта ці не, але вы заўсёды дабіваецеся свайго. Вы будзеце караскацца да самай вяршыні гары, маленькі, скура ды косці, сур'ёзны Казярог, пакуль мы ўсе, такія спрытныя, будзем боўтацца ля падножжа і здзіўляцца, як гэта вам, аднаму з усіх знакаў Задыяка, удалося адолець такі цяжкі маршрут. Напэўна, таму, што вы ўмееце вучыцца на сваіх памылках, і наглядчык Сатурн нарэшце ўзнагароджвае вас перамогай за ўсе вашы пакуты.

І калі гэтая карціна здаецца нерэалістычнай некаму з Казярогаў, не спакушайцеся. Вы можаце спрытна прыкрываць вечнае імкненне да поспеху тонкім пачуццём гумару. Вы можаце заяўляць, што вы вышэй таго, каб штодзённа лічыць капейкі, ці адмаўляць, што вы жывеце ў пастаянным страху перад нечаканай катастрофай. На жаль, я вымушана паведаміць вам, што планеты ўзнагародзілі вас комплексам непаўнацэннасці самай трывалай уласцівасці. Але перш чым вы пачнеце галасіць наконт року, які вызначыў вам Сатурн, успомніце, што гэта вы глядзіце на ўсіх астатніх уніз з вяршыні гары. Вы перажывеце і абставіце ўсіх нас, разам узятых. Магчыма, вам зараз не да смеху, але вы заўсёды смяецеся апошнім.

### РЫЧАРД М. НІКСАН — 9 СТУДЗЕНЯ (2-я ДЭКАДА)

### КАЗЯРОГ-ЦЯЛЕЦ

Нездарма яго называюць «хітры Дзік». Яго палітычная кар'ера дае нам падставу лічыць яго геніем толькі за тое, што ён здолеў атрымаць падтрымку самых уплывовых сіл у краіне... На першы погляд ён выглядае тыграм, але на самой справе ён эмацыянальна баязлівы і мяккі чалавек. Бедны малыш! Ён, напэўна, аддаў бы перавагу вяселлю ў коле сяброў, а не магчымасці трапіць на патэльню задам дзякуючы скандалу, падобных якому гэта краіна яшчэ не бачыла.

Вы спытаеце: калі ён такі пай-хлопчык, навошта ён так хацеў улады? Часткова гэта тлумачыцца яго знакам — Казярог-Цялец. Людзі, народжаныя пад гэтым знакам, схільныя да паранойі. Як толькі ён узняўся на гару Белага Дома, ён закахаўся ў краявіды, якія адкрываліся з вяршыні, і стаў баяцца, што каварныя праціўнікі будуць старацца саштурхнуць яго ўніз. На працягу ўсяго шляху ён ведаў, як зрабіць так, каб іншыя давяралі яму і яго кансерватыўным меркаванням. Але ён не ўмеў давяраць іншым. Самае цікавае тое, што адзіны каварны сапернік, які яго даканаў,— гэта ён сам.

Я не стала б недаацэньваць сілу гэтай дэкады Казярога. Нават улічваючы глыбіню вады пад мастом, я павінна сказаць, што чарадзейства планет, якое ўплывае на Казярога, можа дапамагчы былому прэзідэнту Ніксану вярнуць сабе мінулае становішча ў нейкім сэнсе. Мы пакуль яшчэ не ўсё пачулі ад гэтага старога Казярога!

### АРЫСТОЦЕЛЬ АНАСІС — 15 СТУДЗЕНЯ (3-я ДЭКАДА) КАЗЯРОГ-ДЗЕВА

Ары, якога ўсе мы памятаем як прыемнага мільянера-суднаўладальніка, які валодае пачуццём уласнай годнасці, настолькі ўмела хаваў сваю душэўную збянтэжанасць, што мала хто з нас здагадваўся аб тым, што нервы яго былі нацягнуты, як струна. Па меншай меры, так гаворыць яго натальная карта. Ва ўсім, што датычыцца спраў, грошай, жаніцьбы, гэты грэчаскі Казярог, які выклікае прыхільнасць да сябе, атрымаў такую астралагічную спадчыну, аб якой можна толькі марыць. Ён у літаральным сэнсе не здолеў зрабіць недакладнага кроку і ні разу яго не зрабіў.

Але ва ўплывовым 12-м доме адзіноцтва існуе душэўны непакой, які можа растлумачыць, чаму, нарэшце, ён аддаліўся на востраў далей ад чужых вачэй. Наколькі я магу меркаваць, Джэкі мела поспех у сваім намеры суцешыць Ары тады, калі яму было асабліва адзінока. Мы ж, здаецца, ведаем, што яна ў ім знайшла, ці не так? Напэўна, яе пачуцці рамантычнымі не назавеш, мякка кажучы. І ўсё ж, нягледзячы на тое, што яны не падыходзілі адно аднаму, пані аказалася пад моцным уплывам Казярога-Дзевы, знака Анасіса. Сёння яна вядзе вельмі скрытнае, адасобленае жыццё, што так не падобна на яе, якая прызвычаілася дзякуючы свайму знаку Льва заўсёды быць у цэнтры ўвагі. Я магу дапусціць, што пасля астралагічна ідэальнага шлюбу з Джонам Кенедзі Арыстоцель Анасіс навучыў яе стаяць абедзвюмі нагамі на зямлі, і гэта пайшло ёй на карысць, яна стала лепш. Яна, у сваю чаргу, магчыма, была яму вялікім суцяшэннем і прыносіла вялікую радасць.

# СТУДЫЁН

## ХУТКА ЛЕТА — ЧАС СПАРТЫЎНЫ





## ФПМІ — чэм-пі-ён!

Усё. Спартакіяда БДУ сярод факультэтаў адышла ў гісторыю. Адбыліся апошнія старты, падведзены канчатковыя вынікі, з якіх стала вядома, што пераможцы сёлета, як і летась,— студэнты ФПМІ. З чым мы іх і віншуем!

Асноўны аналіз турніра яшчэ наперадзе. Але некаторыя думкі можна выказаць ужо сёння. Відаць, няблага фізкультурна-спартыўная работа пастаўлена на факультэтах прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, радыёфізікі і электронікі і фізічным. Сведчанне таму — другі год запар яны складаюць тройку пераможцаў Спартакіяды.

На жаль, гэтага нельга сказаць пра юрыдычны факультэт, які, у параўнанні з мінулым годам, апусціўся на два месцы ніжэй. Выбачайце, але шостае месца юрыстам не да твару.

Не вельмі хвалююць спартыўныя справы студэнтаў і кіраўнікоў гістарычнага, філалагічнага і хімічнага факультэтаў. Пра што можна казаць, калі філолагі не ўдзельнічалі ў 7 спаборніцтвах з 18, гісторыкі — у 6, хімікі — у 4.

Карацей кажучы, са спортам у нас не ўсё ў парадку. Праблем і памылак хапае. Але ўсе яны вырашальныя. Трэба толькі пажадаць.

## АЎТАГОЛ

***— Галес, футбол для цябе больш важны, чым жонка. Як я магу жыць з табою?***

***— Супакойся, дарагая, усё ж такі я люблю цябе больш, чым воднае пола ці стральбу з лука.***

* * *

*Футбольны матч скончыўся з разгромным лікам. Капітан каманды, якая прайграла, падышоў да суддзі, сардэчна пацiснуў яму руку і сказаў:*

*— Гэта была бліскучая гульня!*

*— Сапраўды? — здзівіўся суддзя.*

*— Яшчэ б! Дарэмна вы не глядзелі яе!*

* * *

***У перапынку паміж раўндамі трэнер сказаў баксёру:***

***— Калі ты не возьмеш сябе ў рукі, то рызыкуеш атрымаць Нобелеўскую прэмію міру.***

* * *

*Грасмайстар іграў у шахматы з суседам па купэ і... прайграў партыю. Ад нечаканасці грасмайстар усклікнуў:*

*— І падумаць толькі — вы маглі б зрабіць мне мат яшчэ на тры хады раней, каб пашлі ладдзёй!*

*— Як? Ладдзю таксама можна перасоўваць?! — спытаўся спадарожнік.*

* * *

***— Чаму спартсменкі бегаюць не так хутка, як спартсмены?***

***— Выключна з-за какецтва — каб публіка іх лепш разгледзела.***

* * *

*Рэферы лічыць:*

*— Раз, два, тры...*

*— Слухай,— ціха гаворыць секундант баксёру, які ляжыць,— да васьмі не ўставай!*

*— Добра,— стогне той,— а колькі зараз на гадзінніку?*

### ПРАЗ РАСЧЫНЕНЫЯ ДЗВЕРЫ

## ТАКОЕ ВЯДОМАЕ І НЕВЯДОМАЕ КАРАТЭ

***Мы працягваем расказваць пра паходжанне розных відаў усходніх адзінаборстваў. Сённяшні расказ — пра каратэ.***

***Гэты від барацьбы прыйшоў да нас раней за іншыя. Але потым доўгі час каратэ было забаронена ў нашай краіне. Хаця чуць пра яго даводзілася нямала і здавалася, што каратэ не такое ўжо і невядомае. Аднак...***

Каратэ — гэта сучасная японская назва цэлай групы баявых адзінаборстваў, асобныя элементы якой мелі ўласныя назвы ў залежнасці ад часу і месца, дзе імі займаліся, як, напрыклад, кунг-фу, пенчак, то-дэ і інш.

Недзе да 60-х гадоў нашага стагоддзя для большасці еўрапейскіх і амерыканскіх гісторыкаў тэрмін «каратэ» альбо «кунг-фу» быў проста невядомы. У перакладах з хіндзі, кітайскай і японскай моў сустракаецца толькі адна назва — бокс. Гэта і зразумела: для таго, хто не цікавіцца падрабязна ваеннымі мастацтвамі, удакладненне значэнняў не з'яўляецца прадметам асаблівай увагі...

Вядучыя эксперты баявых адзінаборстваў, у прыватнасці з Кітая і Японіі, радзімай каратэ лічаць Індыю. Там для мэтаў кулачнай барацьбы была распрацавана методыка «загартоўкі» рук спосабам удару імі аб каменныя пліты. Прымяняўся таксама ваенны танец, які пераймаў барацьбу кулачнікаў. Шматразовы паўтор гэтага танца з'явіўся цікавым метадам трэніровак.

Меркаванні пра каратэ ў некаторай ступені спекулятыўныя, таму што засноўваюцца на некаторых вершах з антычных сутраў і характэрных канфігурацыях скульптур, што не можа служыць канчатковай высновай. Але калі прыняць, што адзінаборствы былі састаўной часткай культуры Старажытнай Індыі, то можна смела працягваць шлях самай цікавай гіпотэзы, якая тычыцца каратэ.

Кажуць, што будыйскі манах Бодхідхарма прыйшоў у V стагоддзі нашай эры ў Кітай і пасля працяглых падарожжаў спыніўся ў манастыры Шаалінь у правінцыі Хэнань. У манастыры Бодхідхарма ўвёў сістэму фізічных практыкаванняў, у першую чаргу, з аздараўленчай мэтаю. Практыкаванні засноўваліся на руках, якія нагадваюць барацьбу ўрукапашную шляхам нанясення ўдараў.

Гэтая сістэма заставалася гімнастыкай да тых часоў, пакуль будыйскія манахі не ўключыліся ў палітычную і ўзброеную барацьбу. Было гэта прыкладна ў сярэдзіне XIV стагоддзя.

Нельга выключыць і той факт, што манахі, якія падарожнічалі па Кітаю, павінны былі даваць адпор розным рабаўнікам голымі рукамі, без прымянення зброі. Асобныя прыёмы набылі метафізічнае значэнне, і ў іх спрабавалі знайсці філасофскую сімволіку. Вядомы і сёння стыль Ба-гуа з'яўляецца выяўленнем фізічных практыкаванняў вядомых «Васьмі трыграм» Канфуцыя. Існавалі рэлігійныя секты, у якіх фізпрактыкаванні сталі асноўным і самым галоўным абрадам.

Сярод многіх настаўнікаў баявых мастацтваў, што трапілі на Японскія астравы, асаблівую ролю адыграў Гіцын Фунакосі. Вучыць то-дэ (назва «каратэ» ўвойдзе ва ўжыванне крыху пазней) ён пачаў у школах на Акінаве. Калі ў 20-х гадах у Токіо была арганізавана выстава-агляд баявых відаў барацьбы, Фунакосі запрасілі як прадстаўніка Акінавы. Дэманстрацыя то-дэ выклікала ў Японіі вялікую цікавасць. Фунакосі ўжо пакаваў свой багаж, каб вярнуцца дадому, калі яго наведаў мастак Хоан Касугі (ён потым ілюстраваў кнігі майстра), які разам з групай сяброў хацеў навучыцца гэтаму мастацтву.

Фунакосі прыняў прапанову з надзеяй палепшыць сваё матэрыяльнае становішча, бо на Акінаве ён жыў даволі бедна. Першыя гады работы прынеслі яму расчараванне, але потым становішча значна палепшылася. У 1936 годзе былі сабраны сродкі для адкрыцця першага додзё. Крыху раней Фунакосі выдаў дзве кнігі пра каратэ, якія прынеслі яму вялікую папулярнасць. Акрамя ўсяго іншага, аўтар кнігі дадаў да дзікага баявога віда барацьбы філасофска-маральную інтэрпрэтацыю і прыстасаваў яе да душэўнага складу японцаў і спецыфічнай японскай культуры. Многае ўзяў ён з дзюдо (цырыманіял, сістэму іерархічных ступеняў, расклад) і ўвогуле з японскіх звычаяў. «Каратэ не з'яўляецца прыёмам агрэсіі» і «У каратэ няма першай атакі» — сталі дэвізамі гэтага баявога мастацтва.

У канцы 30-х гадоў настрой вайсковай падрыхтоўкі закрануў і додзё. Барацьба зноў пачала выконваць функцыю баявога сцяга — на гэты раз пад ім збіраліся кандыдаты ў будучыя ўладары Азіі, часцей за ўсё моладзь, якая не надта адрознівалася ад той, з радоў якой потым будуць фарміравацца эскадры камікадзэ.

Пасля заканчэння вайны амерыканская адміністрацыя забараніла распаўсюджванне баявых адзінаборстваў як носьбітаў мілітарысцкіх традыцый. Але сярод іх не аказалася каратэ: проста амерыканцы не ведалі гэтай барацьбы. У выніку стварыліся ўмовы для яе шырокага распаўсюджвання, у той час як іншыя віды барацьбы былі забаронены.

У першыя пасляваенныя гады Японія ўступіла ў перыяд імклівага развіцця капіталізму. Навучанне каратэ, асабліва амерыканцаў, стала прыбытковым заняткам. Яшчэ большыя прыбыткі давалі паездкі ў ЗША з паказальнымі выступленнямі, дзе дэманстравалася якраз тое, што ў каратэ з'яўляецца найменш важным і найбольш прымітыўным. Ламанне чарапіцы ўдарам рукі робіць значна большае ўражанне, чым дакладнае выкананне ката.

Саперніцтва паміж асобнымі школамі і каратыстамі часта набывала форму сутыкнення. Пакуль быў жывы Фунакосі, працэс гэты толькі тлеў, але пасля яго смерці (у 1957 годзе) ён разгарэўся велізарным полымем.

Зразумела, існуюць перадпасылкі, пры дапамозе якіх можна растлумачыць папулярнасць «практычнага» каратэ. У сучасным свеце пагроза злачыннасці больш чым адчувальная. Пры нестабільным эканамічным становішчы і сацыяльнай няроўнасці жыццё нагадвае джунглі, дзе дарогу знаходзіць найбольш моцны, найбольш аператыўны, той, хто дзейнічае рукамі.

Многія людзі жывуць страхам, а страх параджае агрэсію. Каратэ могуць займацца толькі тыя, хто бачыць у ім твор мастацтва барацьбы, а не сродак гвалту і забойства.

**Ежы МІЛКОЎСКІ,**
**(з невялікімі скарачэннямі).**

### ПАЛІТЫКА І СПОРТ

## СТРАСЦІ ПА-ЗА СТАДЫЁНАМ

Здавалася б, што дзве сферы нашага жыцця — палітыка і спорт — не павінны перасякацца. Але рэчаіснасць сведчыць пра іншае. І было б добра, калі б палітыка станоўча ўплывала на спорт. Напрыклад, як калісьці менавіта палітыкі сталі ініцыятарамі правядзення гульняў Добрай волі, тым самым зблізіўшы савецкі спорт з амерыканскім, у першую чаргу.

Сёння шмат прыкладаў процілеглых. Ужо шмат гаварылася пра тое, як менавіта палітыка падзяліла на часткі вялікі спорт вялікай краіны. Ахвярай палітыкаў стала Югаславія. Кожны дзень бясконцая вайна прыносіць ахвяры.

Не так даўно Савет Бяспекі ААН прагаласаваў за ўвядзенне санкцый супраць Югаславіі. УЕФА вывела футбольную зборную гэтай краіны з ліку ўдзельнікаў чэмпіяната Еўропы, замяніўшы яе камандай Даніі. І гэта яшчэ, як кажуць, не вечар. Хутчэй за ўсё, МАК прыме рашэнне забараніць югаслаўскім спартсменам выступаць на Алімпіядзе ў Барселоне.

Калісьці непамерны пыл і амбіцыі палітыкаў Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі прывялі да поўнай ізаляцыі гэтай краіны, у тым ліку і ў спорце. Сёння тое ж здарылася і з Югаславіяй. Няўжо памылкі адных не вучаць другіх? Хто ж тады будзе трэцім?

### СПРЫНТ

## СПАДЗЯВАНКА-ЦАЦАНКА?

Яшчэ год таму на чэмпіянаты Беларусі мы амаль не звярталі ўвагі. І не дзіўна: выступалі на іх не самыя мацнейшыя спартсмены, каманды. Лепшыя ўдзельнічалі ў спаборніцтвах больш значнага маштабу (ад першынства СССР і вышэй).

Сёння і самым-самым прыйшлося спусціцца на родную зямлю і выступаць у межах Беларусі. Таму і чэмпіянаты рэспублікі набылі зусім іншае аблічча. Цяпер пераможцы і прызёры атрымліваюць зялёнае святло на шляху ў Еўропу. Стымул — лепш і не прыдумаць.

Першыя рэспубліканскія спаборніцтвы пацвердзілі думку, што на першым часе беларускія супер-клубы не сустрэнуць вялікіх перашкод у барацьбе за чэмпіёнскае званне.

У баскетбольным першынстве Беларусі перамаглі: РТІ (Мінск) сярод мужчын, «Гарызонт» (Мінск) сярод жанчын. Чэмпіёнамі па валейболу сталі мінскія каманды СКА (у мужчын) і «Камунальнік» (у жанчын). Нагадаем, што яшчэ летась гэтыя каманды былі ў кагорце лепшых каманд СССР.

Спецыялісты адзначаюць, што патрэбны час, каб клас каманд выраўняўся. Дасягнуць гэтага можна двума шляхамі: падзення майстэрства лепшых каманд альбо росту майстэрства слабейшых. Будзем спадзявацца на апошні.

## БЕЛАРУСЫ — НА ВЯРШЫНІ П'ЕДЭСТАЛА

Прыйшоў час, калі Беларусь выйшла на міжнародны ўзровень не ў складзе аб'яднанай каманды СНД, а самастойна. Таму на многіх буйнейшых стадыёнах і пляцоўках свету падымаецца сцяг рэспублікі, а пасля ўдалых выступленняў гучыць гімн Беларусі.

Праславіліся беларускія спартсмены і на чэмпіянаце Еўропы па спартыўнай гімнастыцы. У асобных практыкаваннях і Віталь Шчэрба, і Святлана Багінская станавіліся чэмпіёнамі Еўропы з усімі выцякаючымі адсюль акалічнасцямі. Пэўна, гэта адзін з нямногіх момантаў, калі пад гукі «Мы, беларусы...» мала хто звяртае ўвагу на недасканалыя словы.

І яшчэ адна акалічнасць. Сусветная спартыўная супольнасць са здзіўленнем даведалася, што як Шчэрба, так і Багінская — беларусы. Бо дагэтуль савецкіх людзей за мяжой заўсёды называлі рускімі. Нарэшце, гэта недарэчнасць выпраўлена. Лепш позна, чым ніколі.

Матэрыялы старонкі падрыхтаваў А. ЮРЫН.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА

18 чэрвеня

Зак. 2190.

Т. 1000

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.